саморегуляции своего поведения, к сдерживанию отрицательных эмоций (гнева, раздражения, злобы, зависти, чувства мести и др.). Здоровая личность способна к проявлению волевых усилий при отказе от соблазнов (алкоголь, наркотики, курение, ранняя половая жизнь, “легкие деньги” и др.), к преодолению вредных привычек, к творчеству как средству самореализации.

Здоровый образ жизни выступает как социально-педагогическая категория, которая предполагает активность субъекта жизнедеятельности в области созидания своего здоровья, здоровьетворчества. Практическое преобразование себя и своего образа жизни при этом выражается в ряде показателей: двигательная активность; рациональное питание; регуляция эмоциональных реакций, обеспечивающая стрессоустойчивость; контроль за состоянием здоровья и жизненной средой; реализация творческого потенциала, обеспечивающая эмоциональный комфорт; стремление к духовно-нравственному совершенству; отсутствие вредных привычек; умение применять оздоровительные методы и др. Каждый человек, исходя из особенностей индивидуального развития, реального состояния здоровья и характера учебной деятельности, должен иметь индивидуальную программу здорового образа жизни. В этом состоит одна из основных задач системы здоровьесберегающего образовательного процесса и общей культуры человека.

1. *Петленко, В.П.* Этюды валеологии. Здоровье как человеческая ценность / В.П. Петленко, Д.Н. Давиденко. – СПб., 1998. – С. 7–103.

2. *Попов, С.В.* Валеология в школе и дома (о физическом благополучии школьников) / С.В. Попов. – СПб. : Союз, 1997. – 256 с.

3. *Самусева, Н.В.* Шаг за шагом к ЗОЖ / авт.-сост. Н.В. Самусева. – Минск : Красико-Принт, 2009. – 176 с.

## ВОПЫТ ВЫХАВАННЯ ПАТРЫЯТЫЗМУ Ў КРАІНАХ СНД (РАСІІ, УКРАІНЕ, КАЗАХСТАНЕ, УЗБЕКІСТАНЕ)

**Шык К. І.**

*магістар педагагічных навук, выкладчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят, аспірант кафедры педагогікі і сацыякультурнай дзейнасці УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сучасных геапалітычных і сацыяльна-эканамічных умовах патрыятызм уяўляе сабой маральную аснову жыццяздольнасці любой дзяржавы. Патрыятызм як каталізатар актыўнай грамадзянскай пазіцыі асобы рэалізуецца ў самаадданым служэнні Айчыне. Патрыятычная ідэалогія ўяўляе сабой сукупнасць ідэй, канцэпцый, праграм, каштоўнасцей, норм па прынцыповых праблемах развіцця краіны і цесна звязана з карэннымі інтарэсамі грамадзян, палітыкай і штодзённай грамадскай практыкай. Патрыятызм як якасць асобы чалавека выяўляецца ў любові да сваёй Радзімы, імкненні самааддана служыць свайму народу, захоўваць яго мову, культурную і гістарычную спадчыну, звычаі і традыцыі. Аднак у кожнай краіне існуе свая сістэма патрыятычнага

выхавання, якая мае свае традыцыі, законы і нормы. У дадзеным артыкуле, мы паспрабуем разгледзіць праграмы, канцэпцыі і вопыт патрыятычнага выхавання ў Расіі, Украіне, Казахстане і Узбекістане.

Патрыятычнае выхаванне грамадзян у расійскім заканадаўстве разумеецца як сістэматычная і мэтанакіраваная дзейнасць органаў дзяржаўнай улады і арганізацый па фарміраванні ў грамадзян высокай патрыятычнай свядомасці, пачуцця вернасці сваёй Айчыне, гатоўнасці да выканання грамадзянскага абавязку і канстытуцыйных абавязкаў па абароне інтэрасаў Радзімы [3].

Такім чынам, згодна гэтага азначэння, патрыятычнае выхаванне ў Расіі накіравана на фарміраванне і развіццё ў асобы патрыятычных якасцяў, якія дапамогуць людзям паспяхова выконваць грамадзянскія абавязкі ў мірны і ваенны час.

Для дэтальнага разумення сістэмы патрыятычнага выхавання моладзі ў Расійскай Федэрацыі, пералічым асноўныя заканадаўчыя акты, звязаныя з гэтым пытаннем:

1. Дзяржаўная праграма "Патрыятычнае выхаванне грамадзян Расійскай Федэрацыі на 2001-2005 гады" (Зацверджана Пастановай Урада Расійскай Федэрацыі ад 16 лютага 2001 г. № 122) – завершаная;

2. Дзяржаўная праграма "Патрыятычнае выхаванне грамадзян Расійскай Федэрацыі на 2006-2010 гады" (Зацверджана Пастановай Урада Расійскай Федэрацыі ад 11 ліпеня 2005 г. № 422) – з'яўляецца працягам папярэдняй Дзяржаўнай праграмы – завершаная;

3. Дзяржаўная праграма "Патрыятычнае выхаванне грамадзян Расійскай Федэрацыі на 2011-2015 гады" (Зацверджана Пастановай Урада Расійскай Федэрацыі ад 5 кастрычніка 2010 г. № 795) з'яўляецца працягам папярэдняй Дзяржаўнай праграмы [4].

Дадзеныя праграмы прадугледжваюць выпрацоўку і прыняцце ў кожным з суб'ектаў федэрацыі ўласных праграм, арыентаваных на ўнутраную спецыфіку. Асноўнай мэтай дзяржаўных праграм з'яўляецца ўдасканаленне сістэмы патрыятычнага выхавання, якая забяспечвае развіццё Расіі як вольнай, дэмакратычнай дзяржавы, фарміраванне ў грамадзян Расійскай Федэрацыі высокай патрыятычнай свядомасці, вернасці Айчыне, гатоўнасці да выканання канстытуцыйных абавязкаў.

Варта адзначыць, што згодна з меркаваннем "Расійскага нацыянальнага інстытута развіцця ідэалогіі", праца па патрыятычным выхаванні грамадзян, якая праводзіцца дзяржаўнымі інстытутамі, яшчэ нядосыць мэтанакіравана, сістэмна і комплексна. Як адзначаюць навукоўцы, – гэта абумоўленае наступнымі ўмовамі:

1. Недасканаласць нарматыўна-прававой базы, якая рэгулюе дзейнасць органаў дзяржаўнай улады, грамадскіх аб'яднанняў у сферы патрыятычнага выхавання грамадзян.

2. Функцыя каардынацыі дзейнасці ўсіх дзяржаўных інстытутаў, грамадскіх аб'яднанняў па патрыятычным выхаванні грамадзян Расійскай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Федэрацыі не замацаваная за якім-небудзь адным органам у структуры федэральнай выканаўчай улады [2].

Аналіз патрыятычнага выхавання ў Расійскай Федэрацыі паказаў, што сёння там пераважае ваенна-патрыятычны накірунак. Вялікая частка працы вядзецца праз уплывовыя грамадскія арганізацыі, такія як Расійскі арганізацыйны камітэт «Перамога», Міжрэгіянальная дзіцяча-юнацкая грамадская арганізацыя садзейнічання ваенна-спартыўнаму і патрыятычнаму выхаванню «Асацыяцыя Віцязяў», якая ўлучае ў сябе некалькі тысяч аддзяленняў па ўсёй краіне, Нацыянальным Саветам маладзёжных і дзіцячых аб’яднанняў Расіі, Расійскім Саюзам Моладзі, Асацыяцыяй навучэнцаў «Супольнасць», Усерасійскай грамадскай дабрачыннай арганізцыяй «Усерасійскі дабрачынны корпус ратавальнікаў». Прызнаючы важнасць ваенна-патрыятычнага кірунку з пункта гледжання выхавання гатоўнасці да выканання грамадзянамі абавязкаў па абароне Айчыны, варта ўлічваць, што, па-першае, на сучасным этапе Расія паступова пераходзіць да камплектавання сваіх Узброеных Сіл на прафесійнай аснове; па-другое, залішняя мілітарызацыя моладзі не спрыяе фармаванню іміджу Расіі, прывабнага з пункта гледжання сусветнай супольнасці.

Такім чынам, адзначым, што патрыятычнае выхаванне моладзі ў Расіі ажыццяўляецца на інтаграцыйным грунце, супольна з органамі ўлады, спецыялістамі дэпартаментаў, зацікаўленымі структурамі як на Усерасійскім, так і на рэгіянальным, муніцыпальным, лакальным узроўні пэўных арганізацый і ўстаноў. У краіне склалася і функцыянуе дзяржаўная сістэма каардынацыі працы па патрыятычным выхаванні грамадзянаў Расіі, у складзе структур Урада Расійскай Федэрацыі, федэральных органаў выканаўчай улады, органаў выканаўчай улады суб'ектаў Расійскай Федэрацыі. Усталяваны простыя дзелавыя сувязі па частцы патрыятычнага выхавання з грамадскімі аб'яднаннямі, перадусім, ветэранскімі і моладзевымі, з рэлігійнымі канфесіямі. Уся праца дзяржаўных і іншых структур арганізуецца на грунце пяцігадовых дзяржаўных праграм, у якіх робіцца акцэнт на выхаванне пачуцця гонару за сваю краіну і любові да яе, на фарміраванне і развіццё асобы, якая валодае якасцямі грамадзяніна-патрыёта.

Падобная сістэма патрыятычнага выхавання выпрацавана і на тэрыторыі Украіны, дзе ў 2006 годзе створана працоўная група па пытаннях патрыятычнага выхавання моладзі пры Апараце Рады нацыянальнай бяспекі і абароны Украіны. У яе склад увайшлі вядучыя спецыялісты дзяржаўных органаў Украіны, у прыватнасці: Міністэрства па справах моладзі і Міністэрства адукацыі, прадстаўнікі грамадскіх, у тым ліку моладзевых арганізацый. Мяркуецца, што асноўная ўвага павінна засяроджвацца на выхаванні дзяцей і моладзі, фармаванні ў іх нацыянальнай свядомасці.

Таксама на тэрыторыі Украіны функцыянуе закон "Аб агульнадзяржаўнай праграме патрыятычнага выхавання моладзі на 2012-2016 гады", паводле якога адказнасць за патрыятычнае выхаванне моладзі ўскладаецца на органы дзяржаўнай улады і мясцовага самакіравання,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грамадскія арганізацыі, сям'ю і іншыя сацыяльныя інстытуты. Кантроль за выкананнем Праграмы ажыццяўляюць органы дзяржаўнай улады і органы мясцовага самакіравання ў адпаведнасці з іх кампетэнцыяй. Кабінет Міністраў Украіны штогод інфармуе Вярхоўную Раду Украіны аб ходзе выканання Праграмы. Фінансаванне праграмы ажыццяўляецца за кошт сродкаў Дзяржаўнага бюджэту Украіны, мясцовых бюджэтаў і іншых крыніц фінансавання, не забароненых заканадаўствам [1, с. 48-49].

У Рэспубліцы Казахстан падыход да патрыятычнага выхавання крыху іншы. Гэта залежыць як ад разнастайнасці нацыянальнага складу Казахстана, так і ад улады, якая развівае патрыятызм праз усе магчымыя накірункі і формы. У Казахстане уводзяцца цырыманіяльныя працэдуры ў працоўных і вучэбных арганізацыях, якія выхоўваюць павагу да дзяржаўных знакаў. Праводзіцца прапаганда здаровага ладу жыцця, палавое выхаванне, ладзяцца экскурсіі ў наркадыспансеры і месцы зняволення як прэвентыўныя навочныя ўздзеянні, наведванне дамоў малюткі, інтэрнатаў для дзяцей-сірот з мэтай усведамлення ролі сям'і ў жыцці чалавека. Ваенна-патрыятычнае выхаванне праводзіцца праз развіццё ваенна-прыкладных відаў спорту, тэматычныя сустрэчы ў воінскіх частках і з ветэранамі вайны, экскурсіі па музеях баявой славы. Вядзецца праца па ўзмацненні патрыятычнай і гуманістычнай скіраванасці сродкаў масавай інфармацыі пры асвятленні падзей і з'яў грамадскага жыцця. Мінімум 30% эфіру цэнтральных і рэгіянальных СМІ прысвячаецца патрыятычнай тэматыцы.

Дзяржаўнай праграмай па патрыятычным выхаванні прадугледжваецца таксама выпрацоўка адзінага алгарытму правядзення дзяржаўных свят. Для павышэння сацыяльнай эфектыўнасці мерапрыемстваў прапаноўваецца ўдасканаліць тыпавыя сцэнарыі правядзення дзяржаўных свят: Дня Рэспублікі, Дня Канстытуцыі, Дня адзінства народаў Казахстана і іншых. Студэнты ВНУ ўдзельнічаюць ва ўсіх грамадска-палітычных і культурна-масавых мерапрыемствах горада і задзейнічаныя ва ўсіх моладзевых арганізацыях. Штогод для фарміравання еўразійскага духу і атмасферы ўніверсітэцкага патрыятызму праводзяцца экскурсіі ў музей пісьменнасці, да помніка Кульцегіну, у музей-кабінет імя Л.М. Гумілёва, дзе вядучыя прафесары ВНУ чытаюць лекцыі на тэмы навуковай спадчыны гэтага навукоўца [1, с. 177].

Дзейнічае экспазіцыя, прысвечаная жыццю і дзейнасці Прэзідэнта Казахстана. Выкладчыкі і студэнты кафедры журналістыкі рэгулярна дэманструюць фільмы, прысвечаныя дасягненням краіны, сталіцы, універсітэта, што таксама фарміруе патрыятычную свядомасць навучэнцаў.

Узбекістан наадварот доўгі час на дзяржаўным узроўні ніяк не рэгламентаваў патрыятычную дзейнасць, штуршком для развіцця патрыятычнага выхавання на дзяржаўным узроўні стала Дырэктыва Д-18, прынятая Міністэрствам абароны рэспублікі, якая меркавала стварэнне новых і рэанімацыю раней існых ваенна-патрыятычных клубаў і аб'яднанняў у сярэдніх школах, ліцэях, сельскай мясцовасці і ВНУ. Таксама пасля прыняцця праграмы пачалі функцыянаваць ваенна-спартыўныя аздараўленчыя лагеры. Паводле статыстыкі, у перыяд з 2000 па 2004 гг. было створана больш за 100 ваенна-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

патрыятычных клубаў, у якіх штогод праходзілі дапрызыўную падрыхтоўку больш за 2 500 чалавек [1, с. 52].

Часта патрыятычнае выхаванне ажыццяўляецца групамі добраахвотнікаў. Яркім прыкладам стала дзейнасць "Аб'яднання воінаў-ветэранаў інтэрнацыяналістаў Узбекістана", якія пасродкам уласнай ініцыятывы стварылі кадэцкія карпусы і ваенна-спартыўныя класы ў школах з паглыбленым вывучэннем вайсковай справы. Ініцыятыва падтрымана Урадам Узбекістана, курыруецца дзяржавай у асобе Мінабароны, Камітэта па ахове дзяржаўных меж, Службай нацыянальнай бяспекі і Пракуратурай Узбекістана.

Такім чынам, прааналізаваўшы патрыятычнае выхаванне ў шэрагу краін бліжняга і далёкага замежжа, можна зрабіць вывад, што нягледзячы на аднолькавыя мэты, патрыятычнае выхаванне ў кожнай краіне рэалізуецца індывідуальна, што залежыць ад сацыяльна-эканамічных і палітычных фактараў. У вышэй пералічаных краінах існуе вострая патрэба ва ўзняцці патрыятычных пачуццяў, у прыватнасці, моладзі, і выбудоўванні адпаведнай дзяржаўнай палітыкі. Як следства, сістэма выхавання патрабуе распрацоўкі новых канцэптуальных падыходаў да навучання і выхавання падрастаючага пакалення ў патрыятычным кірунку, што і адбываецца.

1. Абдрашитова, Т.А. Передовой опыт по патриотическому воспитанию граждан : метод. пособ. / Т.А. Абдрашитова, Я.Н. Оспанова. – Астана : Издательство ТОО «Агроиздат», 2009. – 236 с.

2. Інтэрнэт партал Вкурсе [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа : http://vkurse.ru/article/2341165/. – Дата доступа : 17.08.2013.

3. Інтэрнэт партал Российский патриотизм и патриотческое воспитание молодёжи [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://www.nirsi.ru/100/. – Дата доступа : 17.08.2013.

4. Официальный сайт Президента России [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа : http://graph.document.kremlin.ru/page.aspx? /. – Дата доступа : 7.11.2013.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ